14. Лапацін, Г. І. З гісторыі вывучэння замоў на Веткаўшчыне / Г. І. Лапацін // Российско-Белорусско-Украинское пограничье : проблемы взаимодействия в контексте единого социокультурного пространства. История и перспективы : матер. Междунар. науч. конф. (Новозыбков, Брянск. обл., 17–18 окт. 2013 г.) / под ред. В. В. Мищенко, В. Н. Пустовойтова, С. Н. Стародубец. – Брянск : РИО БГУ, 2013. – С. 266 – 271.
15. Лапацін, Г. І. «Малачка густога, верху залатога…» : з вопыту вывучэння традыцыйнай культуры Гомельшчыны // Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці. – Гомель, 2004. – С. 255 – 264.
16. Лапацін, Г. І. Святы Георгій у песнях, духоўных вершах, звычаях і замовах / Г. І. Лапацін // Веткаўскі музей народнай творчасці : навук.-метад. зб. / уклад. І. Ю. Смірнова. – Мінск : БелІПК, 2001. – С. 81 – 87.
17. Лапацін, Г. І. Спроба каментара да аднаго фальклорнага тэкста / Г. І. Лапацін // Славянские народы и их культура в современном мире : матер. Междунар. науч. конф. / редкол.: В. И. Коваль (отв. ред.) [и др.]. – Гомель, 1996. – С. 190 – 191.
18. Лапацін, Г. І. Хрысьціянскія матывы ў замовах. З назіраньняў над тэкстамі замоў : з матэр. этнаграф. экспедыцый Веткаўскага музея народнай творчасьці / Г. Лапацін // Материалы международной научно-практической конференции «Российско-Белорусско-Украинское пограничье : 25-летие экологических и социально-педагогических проблем в постчернобыльский период» (Новозыбков, Брянской обл., 26–27 апр. 2011 г.) / редкол.: В. Н. Пустовойтов, С. Н. Стародубец, А. В. Шлома. – Брянск : РИО БГУ, 2011. – С. 310 – 315.
19. Лопатин, Г. И. «А тады ўсё вышоптывалі...» (заговоры деревни Неглюбка Гомельской области) / предисл., публ. и примеч. Г. И. Лопатина ; Г. И. Лопатин // Живая старина. – 2014. – № 1. – С. 21 – 23.
20. Лопатин, Г. И. Заговоры из тетрадей Екатерины Евдокимовны Чуешковой / Г. И. Лопатин // Живая старина. – 2015. – № 4. – С. 40 – 44.
21. Лопатин Г. И. О животноводческой магии Ветковского района / Г. И. Лопатин // Чарнобыль і духоўная спадчына : матэр. навук.-практ. канф. – Гомель, 1991. – С. 59 – 60.
22. Лопатин, Г. И. Обряды и обычаи деревни Шерстин Гомельской области / Г. И. Лопатин // Живая старина. – 2014. – № 2. – С. 9 – 12.

*Ірына Глушэц*

## СУЧАСНЫ СТАН ВЕСНАВОЙ АБРАДНАСЦІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАЛЕССЯ

*Irina Glushec*

## THE CURRENT STATE OF SPRING RITUALS IN GOMEL POLESIE

*У артыкуле прааналізаваны сучасны стан абрадаў Лельчыцкага, Жыткавіцкага і Хойніцкага раёнаў Гомельскай вобласці, прымеркаваных да святаў Стрэчання, Масленіцы, Вялікадня, Юр'я, Тройцы.*

*The article analyzes the current state of the rites in Lelchitsy, Zhitkovichy and Khoiniki districts in Gomel region, dedicated to the spring holidays, such as Strechanne, Maslenitsa, Easter, Yurya, Trinity.*

Традыцыйны народны каляндар Гомельшчыны вызначаецца найбольшай распрацаванасцю святаў веснавога цыкла, і мэта дадзенага артыкула – высветліць сучасны стан асноўных лакальных кропак веснавой абраднасці Гомельскага Палесся. Аснова даследавання – наш досвед працы з 2010 г. метадыстам па этнаграфіі і фальклоры ўстановы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці», у тым ліку ўласныя экспедыцыйныя назіранні.

Веснавы перыяд у народнай традыцыі даследуемай намі тэрыторыі адпаведна больш цёпламу клімату у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі распачынаецца ад свята **Стрэчання** (15 лютага па н.ст.). Правядзенне абраду гукання вясны на Стрэчанне захоўваецца ў памяці старэйшых жыхароў Лельчыцкага раёна, на сённяшні дзень святкаванне з традыцыйнай абраднасцю характэрнае для вёскі Новае Палессе Лельчыцкага раёна. У святочны дзень збіраецца гурт, які абыходзіць вёску з веснавымі песнямі, просячы блаславіць гукаць вясну. Асноўныя завадатаркі гэтага гурта – удзельніцы народнага фальклорнага калектыву «Палескія напевы» мясцовага сельскага клуба, якія з'яўляюцца захавальніцамі ўключанага ў 2009 г. у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь мясцовага стылю выканання традыцыйных песень. Да свята жанчыны ўпрыгожваць рознакаляровымі самаробнымі кветкамі елачку, каб хутчэй прыйшла вясна: «Шоб так, як наша ёлочка хороша, шоб наша і жызнь была такая хороша!» [Зап. Глушэц І.В. у 2015 г. у в. Новае Палессе Лельчыцкага раёна ад мясцовых жыхароў падчас абраду]. Абыходзяць вёску з елачкай, асвечанымі свечкамі, абразом. Спяваюць вяснянкі і водзяць карагоды. Дзяўчынку, якая трымае елачку, некалькі хлопчыкаў пад веснавыя песні жанчын вязуць на санках да крыжа, што стаіць на ростанях у цэнтры вёскі. З просьбамі блаславіць і пажаданнямі здароўя, дабрабыту, міру елачку замацоўваюць на крыжы. Пра актуальнасць традыцыі для мясцовых жыхароў сведчыць факт, што калі арганізаваны клубны калектыў падыходзіць з елачкай да крыжа, там ужо ёсць іншая свежая елачка, якую нехта са старых упрыгожвае і прымацоўвае самастойна. Старое дрэўца, якое было на крыжы з мінулага году, спальваюць разам са старызнай на вогнішчы ўвечары, тады ж арганізуюць святочную вечарыну.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абрад гукання вясны«**Чыpачка**» аграгарадка Тонеж Лельчыцкага раёна праводзіцца ў апошні дзень Масленічнага тыдня. Падобная традыцыя была характэрная для многіх вёсак Тураўскага рэгіёна [1, с. 59–61], аднак у жывой форме захавалася толькі ў Тонежы, а ў іншых месцах – у памяці старэйшага пакалення. У гэтым рэгіёне дзеці і падлеткі гукалі вясну, узлазячы на любое высокае месца: стагі, стрэхі гаспадарчых будынкаў, дрэвы [3, с. 10, 32, 40]. Побач з Тонежам знаходзяцца Чарныцоўскія Горы (іншая мясцовая назва – Горы), на якіх моладзь здаўна гукала вясну. Назву абрад атрымаў ад дробнай качкі «чырачкі» («чырка»), выяву якой у якасці абрадавага пачастунку – коржыкаў – выпякаюць з цеста. Гэтае печыва ўдзельнікі абраду раздаюць аднавяскоўцам, якіх сустракаюць па дарозе на Чарныцоўскія Горы. Туды ідуць, каб раскласці вогнішча і спаліць ляльку-«Зіму», пагукаць вясну песнямі-вяснянкамі і заклікаць «чырачку-птушачку».

На гары таксама водзяць карагоды, качаюцца з яе, частуюцца абрадавымі стравамі, а на самае высокае дрэва (дуб) умацоўваюць упрыгожаную елачку – сімвал дзявоцтва і вясны жыцця. Традыцыя з'яўляецца дзявочай, таму асноўныя яе ўдзельнікі – дзяўчаты, якім дапамагаюць жанчыны сярэдняга і сталага веку. Завадатарамі святкавання з'яўляюцца мясцовыя спявачкі з гурта «Таняжанка» і іх пераемніцы – удзельніцы гурта-спадарожніка «Верас», падлеткі і моладзь. 20 студзеня 2016 г. адбылося пасяджэнне Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры, дзе была падтрымана прапанова аб наданні статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь абраду гукання вясны «Чырачка».

Прыклады свят у Новым Палессі і Тонежы пацвярджаюць высновы даследчыкаў аб тым, што дзеі з абрадавым дрэўцам («ёлкай») з'яўляюцца скразным устойлівым элементам веснавой абраднасці Гомельшчыны [2, с. 30].

Напярэдадні Вялікадня, у Красную суботу, практычна па ўсёй тэрыторыі Гомельшчыны прынята мяняць убранне прыдарожных крыжоў, спальваць старыя рушнікі і фартушкі, крыжы ўпрыгожваць новымі [2, с. 32]. Дзея ўспрымаецца як своеасаблівая форма аброку. Менавіта ў Красную суботу пераапранаюць **каменных «дзевачак»,** што знаходзяцца ля вёсак Баравое і Данілевічы Лельчыцкага раёна. Адпаведна мясцовай легендзе, раней на месцах, дзе сёння знаходзяцца каменныя «дзевачкі», былі палі, на якіх разам з дарослымі працавалі і дзеці. Адна жанчына са сваёй дачкой-падлеткам Евай (ці Ленай, Марыяй) жала жыта. Раптам на небе з'явілася вялікая чорная хмара. На матчын загад хутчэй збіраць снапы дзяўчынка адказала, што вельмі стамілася. Тады маці ў гневе крыкнула: «А каб ты каменем стала!» У той жа час грымнуў гром і бліснула маланка, а калі неба праяснілася, жанчына ўбачыла, што на тым месцы, дзе была яе дачка, стаіць камень [Зап.Глушэц І.В., Мельнікава Л.Г. у 2011 г. у вв. Данілевічы, Баравое Лельчыцкага раёнаад мясцовых жыхароў].

Мясцовыя жыхары шануюць гэтыя камяні, турбуюцца пра іх, як пра жывых дзяўчынак, ахоўваюць, прыбіраюць і шчыра вераць у іх звышнатуральную сілу. У якасці аброку ім аддаюць рушнікі, хусткі, самаробныя фартушкі, упрыгажэнні, кветкі, пачастункі, грошы і г.д. Пакідаючы аброк, людзі просяць у камянёў здароўя, шчасця, дабрабыту для сябе і сваіх блізкіх. Ля камянёў моляцца, спяваюць праваслаўныя псальмы, а таксама (у Баравым) народныя духоўныя вершы. Самім характарам гэтая абрадавая традыцыя садзейнічае захаванню сакральнасці, ужо практычна страчанай у многіх іншых рытуальных дзеяннях. Традыцыя пакланення каменным крыжам вёсак Данілевічы і Баравое Лельчыцкага раёна рэкамендавана для ўключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у 2013 г.

Абрад **«Юр'я»** в. Пагост Жыткавіцкага раёна ўключае ў сябе выдатныя ўзоры старажытных карагодаў і песень, а таксама такіх матэрыяльных праяў рэгіянальнай культуры, як народны касцюм і абрадавы хлеб (каравай). Іншая яго назва – «Тураўскі карагод» – тлумачыцца пашырэннем дадзенай абрадавай практыкі менавіта на тэрыторыі Тураўшчыны. У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключаны першым у краіне сярод нематэрыяльных элементаў – у 2004 г.

Свята Юр'я (у праваслаўнай хрысціянскай традыцыі – дзень святога Георгія Перамаганосца) адзначаецца 6 мая, звязана з аглядам азімага жыта і ўключае ў сябе шэраг абрадавых дзеянняў, скіраваных на ўрадлівасць зямлі і дабрабыт. Раней асноўнымі ўдзельнікамі абраду былі дзяўчаты, зараз яго захавальнікамі з'яўляюцца сталыя жанчыны, якія ўваходзяць у склад народнага фальклорна-этнаграфічнага калектыву «Міжрэчча» Пагосцкага сельскага клуба-бібліятэкі. Удзельнікі гурта прыцягваюць да абраду дзяцей, падлеткаў і маладых жанчын. Асноўныя абрадавыя дзеянні свята ўключаюць выраб і ўпрыгожванне абрадавага хлеба-«карагода», першы выган кароў на пашу, шэсце па вёсцы з зоркай, абразом, граблямі, на якіх начэплены фартух, абрадавымі хлебам-«карагодам» і рушніком, ваджэнне карагодаў на полі, абыход двароў з ваджэннем карагодаў. Заключны этап свята праходзіць каля клуба – гэта самабытныя карагоды, танцы і гульні, якія доўжацца да позняга вечара.

Абрад **«Провады русалкі»** аграгарадка Вялікі Бор Хойніцкага раёна звязаны з заканчэннем святкавання Русальнага тыдня на восьмым тыдні пасля Вялікадня і праводзіцца штогод пасля Тройцы, у наступную нядзелю. Абрад адноўлены жыхарамі, супрацоўнікамі мясцовай установы культуры ў сярэдзіне 1990-х гадоў. Удзельнікі апранаюцца ў святочнае адзенне, рыхтуюць кветкі, плятуць вянкі і пад тыповыя веснавыя абрадавыя песні ідуць ад цэнтра вёскі да поля праводзіць Русалку (на гэтую ролю абіраюць прыгожую дзяўчыну), праганяюць яе ў жыта, асвячаюць сарваную з яе зеляніну, водзяць карагоды і скачуць праз вогнішча, каб атрымаць ачышчэнне агнём. Дзея звязана са спецыяльнымі абрадавымі атрыбутамі: адным вялікім і мноствам малых вянкоў, якія «асвячаюць» над полымем; вялікі вянок удзельнікі разрываюць і разбіраюць зеляніну з яго і з «адзення» Русалкі, каб пакласці на агародах – для добрага ўраджаю.Абрад рэкамендаваны для ўключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у 2013 г.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

У разгледжаных намі абрадавых святах Новага Палесся, Тонежа, Пагоста, Вялікага Бора яскрава праяўляецца сінкрэтызм народнага мастацтва: у карагодах спевы спалучаюцца з харэаграфічнымі элементамі; у гульнях да спеваў і харэаграфіі далучаецца тэатралізацыя, якая праяўляецца таксама ў рэгламентацыі роляў удзельнікаў свята адпаведна полу, узросту, сацыяльнаму статусу; дэкаратыўна-прыкладное мастацтва прадстаўляецца вырабам атрыбутыкі, касцюмамі. Традыцыі святкавання садзейнічаюць яднанню вясковых супольнасцей, бо многія былыя жыхары, якія перасяліліся ў гарады, спецыяльна прыязджаюць на сваю малую Радзімуў святочныя дні, каб прыняць удзел у абрадах, сустрэцца са сваякамі.

Такім чынам, усе разгледжаныя абрады на цяперашні час з'яўляюцца актуальнымі з'явамі, перадаюцца ад пакалення да пакалення – дзецьмі і моладдзю спеўныя, танцавальныя і іншыя лакальныя культурныя традыцыі пераймаюцца ад старэйшых захавальнікаў спадчыны, празпрацу мясцовай самадзейнасціі прызнаюцца мясцовымі супольнасцямі як каштоўнасць, адзначаецца павелічэнне значнасці іх рэкрэацыйных, эстэтычных функцый. Адмоўны ўплыў на іх аказваюць агульныя працэсы ўрбанізацыі – памяншаецца колькасць насельніцтва, ідзе яго старэнне, таму каштоўныя як для Гомельскай вобласці, так і для ўсёй краіны праявы адметнай старажытнай народнай культуры маюць патрэбу ў дзяржаўнай ахове, для чаго праводзіцца іх уключэнне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Спіс літаратуры:**

1. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1993. – 205 с.
2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн. 2 / А.М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агул. рэдаг. Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйш. шк., 2013. – 1231 с. : каляр. іл. + 1 электрон.-апт. дыск (CD-Rom).
3. Фальклор Прыпяцкага запаведніка: па матэрыялах даследавання вёсак Азяраны, Перароў, Пераpoўскі Млынок, Хваенск, Хлупін Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці / І. В. Глушэц, Л. Г. Мельнікава, Г. П. Лой. – Гомель : Установа «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці», 2013. – 76 с.

*Любовь Новик*

## ПРЕТВОРЕНИЕ НАРОДНЫХ ТРАДИЦИЙ КАК ИСТОЧНИК СОЗДАНИЯ САМОБЫТНОГО РЕПЕРТУАРА

*Формирование самобытного репертуара в профессиональных и любительских коллективах напрямую связано с претворением в их творческой деятельности народных традиций.*

*Lubov Novik*

## MAKING FOLK TRADITION AS A SOURCE OF ORIGINAL REPERTOIRE CREATION

*The formation of original repertoire of amateur or professional dance company is directly connected with the implementation of national traditions in their creative activities.*

Сегодня перед творческими коллективами Республики Беларусь стоят важные задачи сохранения культурного наследия и поддержания зрительского интереса к своему творчеству. Вместе с тем сценическое искусство давно не является первостепенной потребностью для широкой аудитории. На это есть ряд причин. Во-первых, в современном мире высоких информационных технологий перед человеком открывается широкий спектр возможностей для удовлетворения его эстетических и творческих потребностей. Во-вторых, профессиональные и любительские труппы не могут каждый сезон обновлять свой репертуар, так как каждая новая постановка требует больших материальных затрат, а бюджетных средств на субсидирование театров, хореографических и вокальных коллективов стало выделяться меньше. В современных реалиях сложно удержать зрителя, а также привлечь нового на спектакли и программы, уже созданные ранее и не раз показанные на белорусских и международных площадках. Решением существующей проблемы может стать создание в каждом коллективе самобытного репертуара, отвечающего эстетическим установкам сегодняшнего дня.

Одним из таких коллективов является Белорусский государственный заслуженный хореографический ансамбль «Хорошки», в творческой деятельности которого плодотворно используются народные традиции и фольклорные танцевальные образцы, относящиеся к различным периодам существования белоруской народности. На их основе создаются яркие высокохудожественные программы, которые входят в «золотой фонд» народно-сценической хореографии. Это помогает поддерживать интерес к творчеству коллектива и способствует сохранению национального танцевального наследия.

Со времени выхода своей первой программы и в последующие годы коллектив «Хорошки» отличается от других стремлением к зрелищности и театральной яркости хореографических спектаклей. Каждый концертный номер – это целостное действие, где танцевальные, инструментальные и вокальные части тесно взаимосвязаны и органично дополняют друг друга.

В коллективе осознается необходимость синтеза народных элементов с техникой классического и пластикой эстрадного танцев, что делается, в первую очередь, с целью удовлетворения потребностей современного зрителя. Еще в первых постановках ансамбля в народно-сценический танец была внесена классическая техника, высокие прыжки, нововведением, например, явилось внедрение в белорусскую



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ